КРАЕВЕДЧЕСКИЙ

# ВЫСТАЎКА ВЫРАБАЎ БЫТАВІКОЎ

Салігорскі камбінат бытавога абслугоўвання арганізаваў у нядзелю ў памяшканні летняй эстрады выстаўку сваіх вырабаў. У ёй прынялі ўдзел Салігорскі, Любанскі, Старобінскі, Чырвонаслабодскі, Урэцкі камбінаты бытавога абслугоўвання і Доўгаўскія майстэрні.

Шматлікія наведвальнікі азнаёміліся са швейнымі вырабамі, новым і адрамантаваным абуткам, работай фатаграфіі і інш. Асаблівую цікавасць выклікалі трыкатажныя вырабы. Гэта была першая работа салігорскіх трыкатажніц. Праз некалькі дзён адкрыецца трыкатажны цэх.

Перад наведвальнікамі выстаўкі выступіў са справаздачай аб рабоце бытавікоў дырэктар камбіната бытавога абслугоўвання тав. Спірын Ф. С. Затым калектыву Старобінскага цэха масавага пашыну адзення (майстар тав. Якубовіч Г. С.) было ўручана пасведчанне аб прысваенні яму ганаровага звання цэха камуністычнай працы. 12 лепшым работнікам камбінатаў уручаны пасведчанні ўдарніка камуністычнай працы.

З цікавасцю праслухалі наведвальнікі інфармацыю аб новых модах адзення і паглядзелі дэманстрацыю іх на жывых манекенах.

Перад закрыццём выстаўкі адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці Салігорскага, Чырвонаслабодскага і Старобінскага камбінатаў бытавога абслугоўвання.

С. МАРОЗАЎ,

галоўны інжынер Салігорскага камбіната бытавога абслугоўвання.